# НавінЫ

БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 11 (28) кастрычнік 2000 г.

# "ВЫБАРЫ" Ў ПАПАТУ НЕ АДБЫЛІСЯ

***ПАВОДЛЕ ЗЬВЕСТАК ПРЭСАВАЙ ГРУПЫ БНФ НА 16 КАСТРЫЧНІКА, ВЫБАРЫ Ў ПАЛАТУ НЕ АДБЫЛІСЯ Ў 41 АКРУЗЕ***

Байкот адбыўся. У Менску гэта было найбольш відавочна: на лукашэнкаўскія выбары тут пайшло крыху больш за 30%. У бальшыні вялікіх гарадоўржым таксама праваліў выбары. Ноччу ўлада ў паніцы спрабавала фальсыфікаваць іхныя вынікі. Дапамог рэжыму і працэнт папярэдняга галасаваньня, якое ёсьць суцэльным злачынствам.

Тым ня менш, галоўны вынік Байкоту - 2000: ніякім праўным чынам палата сфармаваная быць ня можа.



### *МЕНСК*

Паводле зьвестак назіральнікаў, ва ўсіх 18 акругах сталіцы выбары былі прабайкатаваныя. У сваю чаргу, ЦВК сьцьвярджае, што толькі ў 3 акругах выбары не адбыліся.

### *БЕРАСЬЦЕ*

Выбары не адбыліся ў 4 акругах. Правал выбараў у горадзе афіцыйна прызнаў Цэнтарвыбаркам. Датэрмінова прагаласавалі каля 10% насельніцтва.

### *МАГІЛЁЎ*

Улады кажуць аб тым, што ў Магілёве выбары адбыліся. Але назіральнікі сьцьвярджаюць, што ўва ўсіх трох акругах гораду быў байкот: галасаваць прыйшло ня больш за 45%.

### *ГОМЕЛЬ*

Зноў жа, афіцыйная інфармацыя не супадае са зьвесткамі незалежных назіральнікаў. Як сьцьвярджаюць назіральнікі, выбары не адбыліся ў акругах № 33 і 35. Датэрмінова ў Гомлі прагаласавала 13%. У Гомельскім раёне – 17%. У Буда-Кашалёве, паводле зьвестак камісіяў, датэрмінова прагаласавала ажно 23% выбарнікаў.

### *ВІЦЕБСК*

Ва ўсім Віцебску (4 акругі) выбары не адбыліся. Гэты факт прызналі ўлады.

17 акруга г.Віцебска: прагаласавала 39,68% (зьвесткі незалежных назіральнікаў), 44,8% (афіцыйныя зьвесткі).

Кастрычніцкая акруга 38,75% (зьвесткі назіральнікаў), 41,78% (афіцыйныя).

Датэрмінова прагаласавала 9%-12% насельніцтва.

Паводле зьвестак на 16 кастрычніка, выбары не адбыліся таксама ў наступных гарадах: ***МАЛАДЗЕЧНА*** – 1 акруга, ***БАРЫСАЎ*** – 1, ***САЛІГОРСК*** – 1, ***МАЗЫР*** – 1, ***ЖОДЗІНА*** – 1 (яўка каля 42%), ***НАВАПОЛАЦАК*** – 1, ***ЗАСЛАЎЕ*** – 1 (яўка каля 35%), ***БАБРУЙСК*** – 1, ***БАРАНАВІЧЫ*** – 1 і ***СЬВЕТЛАГОРСК*** – 1.

Усяго, паводле зьвестак аб"яднанай апазыцыі, у «выбарах» удзельнічала толькі 45% выбарнікаў. Выбары не адбыліся ў 41 акрузе, што больш чым дастаткова, каб у сёй краіне байкот прайшоў з посьпехам.

vytoki.net

# У Менску прайшла масавая акцыя "Супраць дыктатуры! Супраць выбарчага фарсу!"



***14 кастрычніка ў Менску прайшла акцыя беларускай апазыцыі "Супраць дыктатуры! Супраць выбарчага фарсу!". Шэсьце, у якім удзельнічала некалькі тысячаў чалавек, рушыла а 15 гадзіне ад Акадэміі навук да Опэрнага тэатру. Удзельнікі скандавалі лёзунгі "Жыве Беларусь!", "Байкот!", "Сёньня Мілошавіч - заўтра Лука!".***

Менчукі выйшлі на вуліцы каб засьведчыць сваё рашэньне не прымаць удзелу ў выбарчым фарсе, арганізаваным Лукашэнкам. Удзельнікі акцыі шырока выкарыстоўвалі карнавальныя элемэнты: моладзь зь бел-чырвона-белым грымам на тварах, беларускія й эўрапейскія сьцягі, у неба на балёніках быў узьняты нацыянальны беларускі сьцяг. Маладафронтаўцы спальвалі цэлыя пачкі чырвона-зялёных запрашэньняў на заўтрашнія выбары ў "палату" і кідалі іх у сьметніцы з надпісам "выбіральня".




Варта нагадаць, што шэсьце 14 кастрычніка меркавалася правесьці ад Акадэміі навук да плошчы Незалежнасьці, аднак улады не далі дазволу на такі маршрут. Імі ў чарговы раз была прапанаваная "рэзэрвацыя" - плошчы Бангалор. Прадстаўнікі аб'яднанай апазыцыі з такім маршрутам не пагадзіліся й падчас усіх сустрэчаў з уладамі настойвалі на першачарговым варыянце. 13 кастрычніка пасьля доўгіх перамоваў, якія вяліся ў прысутнасьці прадстаўнікоў эўрапейскіх структураў, як здавалася, быў дасягнуты кампраміс: шэсьце пойдзе праспэктам Скарыны, далей вуліцамі Варвашэні й Багдановіча да Опэрнага тэатру.

Аднак у дзень правядзеньня акцыі стала вядома, што ўлады, не зважаючы на дасягнутыя раней дамоўленасьці, шэсьце да Опэры забаранілі. Гэта, аднак, не перашкодзіла менчукам трымацца менавіта таго маршруту, пра які было дамоўлена напярэдадні, і калёна дайшла да плошчы Парыскай камуны ля Опэрнага тэатру. Тут адбыўся кароткі мітынг, на якім выступілі Старшыня БНФ Вінцук Вячорка, Старшыня АГП Анатоль Лябедзька, лідэр Маладога Фронту Павал Севярынец і намесьнік Старшыні БНФ Вячаслаў Сіўчык. "Наш адказ заўтрашнім выбарам – байкот!", – сказаў у сваім выступе Вінцук Вячорка. "Заўтра нам у чарговы раз прапануюць галасаваць за чужацкую ўладу, якая ня мае ў сабе нічога беларускага. Заклікаем вас не ісьці заўтра на выбары, а прысьвяціць гэты дзень чамусьці іншаму", - такімі былі словы Вясчаслава Сіўчыка. Сп. Сіўчык заклікаў людзей прыйсьці 29 кастрычніка на Дзяды, сьвята паміналаньня. А 11.30 у гэты дзень ад Акадэміі навук мусіць рушыць жалобнае шэсьце да Курапатаў.

Выступы палітыкаў чаргаваліся з кароткімі імпрэзамі: сьпявалі барды Зьміцер Бартосік і Андрэй Латушкін, была паказаная тэатралізаваная "Батлейка пана Скіргайлы", у якой кожны мог выразна ўбачыць палітычныя актуаліі сучаснай Беларусі.

Пасьля заканчэньня акцыі беларуская тэлевізія абрушыла прапагандовы шквал на прадстаўнікоў апазыцыі. У "Панараме" сымптаматычна памыліліся, сказаўшы, што ў акцыі апазыцыі ўдзельнічала "ад 2 да 2,5 чалавек". Прэсавая служба МУС паведаміла, што арганізатары акцыі "будуць адказваць згодна з законам".

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**



# У 22 гарадах краіны прайшлі масавыя акцыі за байкот "выбараў"

***8 кастрычніка ў 22 найбуйнейшых гарадах Беларусі адбыліся масавыя акцыі, якія праводзіла аб'яднаная апазыцыя ў рамках кампаніі "Байкот - 2000". У некаторых зь пералічаных месцаў падобныя акцыі прайшлі ўпершыню за апошнія 6 год. У рэгіёны, каб узяць удзел у мітынгах, шэсьцях, сустрэчах з выбарнікамі, выяжджалі вядомыя беларускія палітыкі. Туды ж скіраваліся і журналісты ды назіральнікі ад АБСЭ. Удзельнікі агітавалі не ісьці на т.зв. выбары 15 кастрычніка.***

***Рэжым відавочна нэрваваўся пасьля югаслаўскіх падзеяў. Таму некаторыя акцыі завяршыліся затрыманьнямі.***

### *Горадня*

Паколькі "Марш Свабоды" гарадзенскі гарвыканкам забараніў, то людзей на сустрэчу з выбарнікамі сабраў пляц Леніна. Каля 2.000 чалавек прыйшлі на сустрэчу, каб выказаць свае адносіны да выбарчага фарсу. Удзельнікі мітынгу прынялі рэзалюцыю, у якой зазначана, што выбары 15 кастрычніка – несвабодныя й несправядлівыя. Гарадзенцы, якія прыйшлі на мітынг, адмовіліся ад удзелу ў "выбарах" і заклікалі іншых выбарнікаў зрабіць тое ж самае. На сустрэчы выступіў старшыня БНФ Вінцук Вячорка.

Пасьля заканчэньня мітынгу прагучаў заклік занесьці нацыянальныя й эўрапейскія сьцягі да сядзібы БНФ у Горадні. Такім чынам, адбылося шматлюднае несанкцыянаванае шэсьце ў кірунку пляц Леніна – вуліца К. Маркса.

### *Слонім*

Як сьцьвярджаюць тыя, хто ўдзельнічаў у пікеце, інфармацыю пра байкатаваньне выбараў атрымалі больш за тысячу чалавек. На пікеце раздавалі газэту "Рабочы" й улёткі з заклікамі да байкоту. Актывісты зьбіралі подпісы за 4 умовы АБСЭ, вёўся запіс у сябры БНФ.

Пікет адбываўся з 11.00 да 13.00 і прайшоў без перашкодаў з боку ўладаў.

### *Ліда*

У Лідзе мітынг спачатку быў забаронены. Але за два дні да акцыі намесьнік старшыні гарвыканкаму У. Малец прапанаваў сп. Корбану, які падаваў заяўку, правесьці мітынг на лідзкім Кургане. Такім чынам, у суботу заяўнік і гарвыканкам прыйшлі да дамоўленасьці, што зьбірацца на мітынг будуць на пляцы Леніна, а затым пяройдуць да Кургана.

Мітынг вёў старшыня гарадзкой арганізацыі БНФ сп. Станіслаў Суднік. На мітынгу прысутнічала каля 60 чалавек. У якасьці назіральнікаў у горад прыехалі прадстаўнікі АБСЭ; былі і журналісты.

Актывісты трымалі лёзунгі: "Не - выбарчаму фарсу!"; "Байкот – 2000"; "Перамаглі сэрбы – пераможам і мы". Аднак лёзунг "Не – выбарчаму фарсу!" міліцыянты прымусілі прыбраць.

Па сканчэньні пікету міліцыя запрасіла да сябе старшыню гарадзкой арганізацыі БНФ Станіслава Судніка, старшыню гарадзкой арганізацыі БСДП(НГ) Алеся Судара, сябру АГП Віктара Аўгусьціна, у якога на штанах была налепка "Все на выборы", а таксама Паўла Анацку за "візуальную агітацыю" – бо ён трымаў лёзунг "Не – выбарчаму фарсу!". Праўда, потым, так і ня ня склаўшы пратаколу, людзей адпусьцілі.

### *Магілёў*

У суботу 7 кастрычніка сябры БНФ, узяўшы плякаты "Байкот фальшывым выбарам!", "Выбары ў палату – падман народу!", прайшліся па цэнтры гораду. У выніку былі затрыманыя Сяржук Гіркін і Андрэй Качуроўскі. У іх канфіскавалі плякаты, а дакумэнты пра іх "праваПарушэньні" паабяцалі даслаць у адміністрацыйныя камісіі па месцы жыхарства.



Мітынг у Жодзіна

8 кастрычніка, у дзень сустрэчы з выбарнікамі, міліцыянты блякавалі штаб-кватэру БНФ, абшуквалі людзей, што выходзілі адтуль. Увесь цэнтар гораду быў ачэплены. Але, тым ня менш, на сустрэчу з выбарнікамі прыйшло да 500 чалавек.

Былі спробы арыштаваць арганізатара сустрэчы - Віталя Макаранку. Пасьля сустрэчы з выбарнікамі затрымалі Міколу Сісько, які нёс зь мітынгу мэгафон. У яго запісалі дадзеныя і паабяцалі выклікаць у суд.

### *Бабруйск*

З-за таго, што мітынг быў забаронены, у бабруйску была арганізаваная сустрэча з выбарнікамі, на якую прыйшло 100 чалавек. Нікога не затрымалі, але старшыні гарадзкой арганізацыі БНФ "Адраджэньне" зрабілі папярэджаньне за арганізацыю пікету.

### *Берасьце*

Акцыя ў Берасьці сабрала 2.000 чалавек, але магло быць і больш, калі б мясцовыя ўлады не зьнялі ў гэты дзень маршрут аўтобусаў, які ішоў на месца збору.

На мітынгу выступалі Ю. Хадыка, намесьнік старшыні БНФ, С. Шушкевіч, старшыня БСДГ, Р. Бакіевіч, старшыня гарадзкой арганізацыі БНФ, С. Бахун,

Працяг на стар.4


vytoki.net

пачатак на стар. 3

# У 22 гарадах краіны прайшлі масавыя акцыі за байкот "выбараў"


Горадня. Моладзь выбірае незалежнасьць

старшыня берасьцейскай арганізацыі МФ і інш. Удзельнікамі мітынгу былі прынятыя 2 рэзалюцыі. У адной зь іх удзельнікі мітынгу заклікаюць берасьцейцаў выкарыстаць сваё кастытуцыйнае права - не ісьці на выбары, ня браць удзелу ў фарсе, які за народныя грошы ставіць нелегітымны "прэзыдэнт", каб захаваць сваю нелегітымную ўладу. У другой рэзалюцыі віталася перамога дэмакратычных сілаў у Сэрбіі.

### *Баранавічы*

Каля 500 чалавек прыйшлі на баранавіцкі мітынг, што быў прысьвечаны байкатаваньню выбараў. Пасьля заканчэньня мітынгу, на якім выступалі В. Івашкевіч і іншыя палітыкі зь Менску, а таксама мясцовыя лідэры апазыцыі, 100 чалавек рушыла ў цэнтр гораду.

### *Пінск*

На мітынгу прысутнічала 300 чалавек. Акцыя прайшла на незапланаваным месцы, бо на тым месцы, пра якое дамаўляліся з уладамі, не было магчымасьці падключыць апаратуру - чамусьці адсутнічала электрычнасьць.

### *Жодзіна*


8 кастрычніка. Жодзіна

Яшчэ напярэдадні акцыі, у суботу вечарам, невядомыя кідалі камяні ў вокны офіса БНФ, а затым тэлефанавалі і пагражалі старшыні арганізацыі Аляксею Лапіцкаму.

Але акцыя, як і плянавалася, пачалася ў 13.00, хаця і тут былі перашкоды: прадстаўнікі міліцыі паведамілі арганізатарам пікету, што ёсьць загад хапаць удзельнікаў (хаця далейшыя падзеі паказалі, што гэта былі запалохваньні, бо нікога не затрымлівалі); не далі падключыць гукаўзмацняльную апаратуру.

Падчас таго, як выступаў прамоўца, маладыя брытагаловыя людзі кідалі ў яго скамечанай паперай, на што міліцыя не рэагавала. Потым тыя ж брытагаловыя ўдарылі ў твар сына Аляксея Лапіцкага, на што міліцыя, зноў жа, ніяк не адрэагавала.

На акцыі раздавалі газэты, прысьвечаныя акцыі "Байкот-2000", зьбіралі подпісы за 4 умовы АБСЭ. Моладзь запісвалася ў ТБМ.

### *Барысаў*

Акцыя ў Барысаве сабрала некалькі дзясяткаў чалавек. У горад прыехалі таксама 3 назіральнікі з АБСЭ і шэраш карэспандэнтаў: з "Народнай волі", "Рабочага", радыё "Свабоды", журналісты са Швэцыі.

### *Маладэчна*

У Маладэчне пікет адбываўся ў 2-х розных месцах, на 2-х рынках. Актывісты распаўсюджвалі бюлетэні "Навіны БНФ" і "Права на волю". Затрыманьняў не было.

### *Слуцак*

На сустрэчу з выбарнікамі сабралася каля 120 чалавек. Выступалі сп. Грыцкевіч (БНФ), сп. Баранаў (БНФ) і інш., што дапамагло сустэчы паратварыцца ў мітынг. На акцыі раздавалі ўлёткі, зьбіралі подпісы за 4 умовы АБСЭ. "Прысутнічала" шмат міліцыянтаў, намесьнік старшыні гарвыканкама па сувязях з грамадзкасьцю.

### *Салігорск*

Сустрэча з выбарнікамі прайшла ў Салігорску на кірмашы. Там былі затрыманыя сп. Баранаў і сп. Голасаў - толькі за тое, што размаўлялі з выбарнікамі й раздавалі ўлёткі.

### *Віцебск*

У Віцебску акцыя пачалася з шэсьця, у якім удзельнічала 250-270 чалавек. Калі пачаўся мітынг, колькасьць удзельнікаў павялічылася да 400. Адбылося 7 арыштаў. Былі затрыманыя сп.сп. А. Прахарэнка, С. Гродзь, М. Воўкаў, С. Сьмірноў, А. Саўчанка, С. Доўгі, С. Васенка. Усе яны былі дастаўленыя ў Кастрычніцкі РАУС, дзе прасядзелі гадзіну за збор подпісаў пад ўмовамі АБСЭ.

### *Наваполацак*

На акцыю "Байкот-2000" у Наваполацак прыйшло больш за 100 чалавек.

vytoki.net

### Ворша

На несанкцыянаваны "марш Свабоды" у Воршы прыйшло каля 80 чалавек. Шэсьце працягвалася 15 хвілінаў, а затым пачаўся мітынг, на якім выступалі прадстаўнікі КХП – БНФ.

### Гомель

На акцыю пратэсту ў рамках "Байкоту-2000", якую падрыхтавала апазыцыя, прыйшло больш за 500 чалавек. Пра свае адносіны да выбараў у палатку расказалі Анатоль Лябедзька й Алесь Бяляцкі.

### Мазыр

На сустрэчы з выбарнікамі прысутнічала 30 чалавек. Было шмат міліцыі, якая некалькі разоў спрабавала спыніць сустрэчу й скласьці пратаколы на ўдзельнікаў.

### Рэчыца

250 чалавек актыўна падтрымалі акцыю апазыцыі "Байкот-2000". На мітынгу прамаўляў Станіслаў Багданкевіч і іншыя палітыкі.

### Сьветлагорск

Мітынг, у парушэньне заканадаўства быў дазволены толькі за 2 дні да заяўленай даты. На мітынгу прысутнічала 200 чалавек.

### Жлобін

Некалькі дзясяткаў удзельнікаў прысутнічала па пікеце ў Жлобіне. Актывісты распаўсюджвалі газэту "Рабочы" й "Навіны БНФ".

### Рагачоў

Сп. Лабковіча (БНФ) і сп. Альфера, што ехалі на сустрэчу з выбарнікамі ў Рагачоў, затрымалі пры ўезьдзе ў горад ды правялі "прафіляктычную працу", нагадваючы аб адказнасьці, якую нясуць тыя, хто ўдзельнічае ў забароненай акцыі. Калі менчукі прыехалі, сустрэча з выбарнікамі ўжо пачалася, хаця міліцыя настойліва прапаноўвала ўдзельнікам (невядома зь якіх прычынаў) пайсьці ў якое-небудзь памяшканьне. Удзельнікі, каб не абвастраць сытуацыю, вымушаныя былі скончыць акцыю, толькі распачаўшы.

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**



## Апазыцыя выказала сваё задавальненьне тым, як праходзілі акцыі 8 кастрычніка

***На прэсавай канфэрэнцыі па выніках масавых акцыяў 8 кастрычніка лідэры апазыцыі назвалі прыкладную лічбу ўдзельнікаў. Паводле падлікаў арганізатараў, маршы, мітынгі, сустрэчы з выбарнікамі, якія прайшлі ў 22 гарадах Беларусі, сабралі агульнай колькасьцю 10.000 чалавек - такую лічбу назваў Віктар Івашкевіч, намесьнік Старшыні БНФ.***

Кіраўнікі Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сілаў далі станоўчую ацэнку таму, як праходзілі акцыі ў рэгіёнах. Вось што сказаў Вінцук Вячорка, старшыня БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ: "Мы задаволеныя, што адбыўся беспрэцэдэнтны геаграфічны ахоп. Гэта паказвае, што структуры дэмакратычнай апазыцыі працуюць эфэктыўна". Быў прыведзены й такі паказальны факт: падчас несанкцыянаванага шэсьця ў Горадні, у якім удзельнічала блізу 2.000 чалавек, нарадзіўся актуальны лёзунг, які можа прыжыцца і ў іншых беларускіх гарадах: "Сёньня Мілошавіч – заўтра Лука!".

Трэба адзначыць, што эфэктыўнасьці акцыяў спрыяла тое, што ў рэгіёны выехалі палітыкі: прадстаўнікі БНФ, АГП, БСДП (НГ), Партыі жанчын "Надзея". Прадстаўнікі БНФ зь Менску наведалі 8 кастрычніка наступныя гарады:

Берасьце (Ю. Хадыка)
Баранавічы (В. Івашкевіч)
Горадня (В. Вячорка)
Ліда (В. Сіўчык)
Слонім (Г. Сямдзянава)
Барысаў (Ю. Зянковіч, Церашкоў)
Жодзіна (І. Табушава, А. Шэін)
Слуцак (А. Грыцкевіч, В. Баранаў)
Салігорск (В. Баранаў)
Віцебск (П. Севярынец)
Наваполацак (У. Кішкурна, Станкевіч)
Гомель (А. Бяляцкі)
Сьветлагорск (Л. Баршчэўскі, Ілюкевіч)
Рэчыца (А. Янукевіч)
Жлобін (С. Шынкевіч)
Рагачоў (У. Лабковіч)
Магілёў (А. Трусаў)
Бабруйск (І. Саверчанка)

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

## ШТО РАБІЛІ ЛІДЭРЫ АПАЗЫЦЫІ 15 КАСТРЫЧНІКА?

***15 кастрычніка кампанія "Байкот - 2000" была ў сваім піку. Лідэры апазыцыйных партыяў і арганізацыяў рабілі ў гэты дзень тое, да чаго заклікалі ўсіх беларусаў: альбо адпачывалі, альбо працавалі. Бальшыня была далёка ад тых месцаў, дзе рэжым імітаваў "выбары ў парлямэнт".***



**ВІНЦУК ВЯЧОРКА**, старшыня БНФ, падчас выбараў у палатку быў у офісе Партыі БНФ: тэлефанаваў, цікавіўся тым, як праходзіць галасаваньне, а таксама сачыў за актуальнымі падзеямі праз Інтэрнэт.

**ЗЬМІЦЕР БАНДАРЭНКА**, каардынатар Хартыі'97 у дзень выбараў у палатку паехаў разам з сябрамі ў лес, дзе меў магчымасьць "добра адпачыць на сьвежым паветры і атрымаць асалоду ад беларускай прыроды".



**АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА**, старшыня Аб'яднанай Грамадзянскай Партыі, распавёў, што 15 кастрычніка для яго быў днём адпачынку. За апошнія 2 месяцы гэта першы дзень, калі сп. Лябедзька дазволіў сабе ляжаць на канапе і чытаць газэты, якія сабраліся за гэты час.

**АЛЯКСЕЙ КАРОЛЬ**, намесьнік старшыні БСДП (НГ), прытрымліваўся актыўнага байкоту выбараў. 15 кастрычніка першую палову дня ён абходзіў выбарчыя ўчасткі і назіраў, як праходзіць галасаваньне. Увечары сп. Кароль таксама "займаўся палітычнай працай".



**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**, лідэр Маладога Фронту, 15 кастрычніка праз ўва Ўправе БНФ, дзе працаваў з дакумэнтамі, а таксама цікавіўся інфармацыяй з галасаваньня, якая найхутчэй трапляла ва Ўправу.

*Прэсавая група БНФ нагадвае, што кампанія "Байкот - 2000" будзе доўжыцца да 29 кастрычніка, калі адбудзецца "другі тур выбараў". Да гэтага дня будуць адбывацца сустрэчы з выбарнікамі, раздача літаратуры, збор подпісаў за чатыры ўмовы АБСЭ.*

*Байкот - акцыя, якая палюбілася беларусам. 29 кастрычніка будзе яшчэ адзін добры шанец гэта даказаць - калі на ўчасткі, дзе ўлады зьбіраюцца праводзіць галасаваньне, прыйдзе менш за 25% выбарнікаў.*

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

vytoki.net

# Сьціпласьць сапраўднае моцы. Ціхмянасьць сапраўднае велічы.



***Менавіта такімі словамі рэспубліканскі кандыдат на пасаду прэзыдэнта ЗША Джордж Буш-малодшы акрэсьлівае амэрыканскі характар, які будзе адлюстроўваць ягоная вонкавая палітыка.***

Прэзыдэнцкія выбары, што маюць адбыцца ў ЗША 7 лістапада гэтага году, назавуць імя чалавека, які ў бліжэйшыя гады будзе ня толькі вызначаць кірункі нутранага разьвіцьця Злучаных Штатаў, але й актыўна ўплываць на эканамічныя й палітычныя працэсы ўва ўсім сьвеце. Але нават сёньня, за месяц да галасаваньня , прадказаць ягоныя вынікі абсалютна немагчыма. Паводле апошніх



апытаньняў выбарнікаў, праведзеных аўтарытэтнай кампаніяй Gallop, за кожнага з кандыдатаў – а канкурэнтам Буша, нагадаю, зьяўляецца дзеючы віцэ-прэзыдэнт, дэмакратАльберт Гор – гатовыя аддаць сёньня свае галасы на 45% амэрыканцаў. І гэты балянс будзе парушаны на карысьць аднаго з прэтэндэнтаў пад уплывам выключна эмацыйных фактараў: удалая сваечасовая ўсьмешка ці пяшчотны пацалунак перад камэрамі маюць сёньня большае значэньне, чым перадвыбарчыя праграмы.

Разам з тым, пакуль амэрыканскія выбарнікі ацэньваюць зьнешнія й артыстычныя дадзеныя кандыдатаў, палітыкі ўсяго сьвету аналізуюць іх праграмы ці пралічваюць наступствы перамогі як Буша, так і Гора, для сваіх краінаў.

Беларускі Народны Фронт, безумоўна, зацікаўлены ў тым, каб новым прэзыдэнтам ЗША стаў рэспубліканец Джордж Буш. Ня толькі таму, што рэспубліканскія каштоўнасьці й сьветапогляд вельмі блізкія да фронтаўскіх, і ўжо некалькі гадоў паміж нашымі партыямі існуюць партнэрскія стасункі. Ня менш істотным для нас зьяўляецца й лёс Беларусі ў агульнасусьветным кантэксьце. І зьнешнепалітычныя прыярытэты партыі Буша ў значна большай ступені, чым намеры Гора, нацыянальным інтарэсам Беларусі.

## *Беларускі Народны Фронт, безумоўна, зацікаўлены ў тым, каб новым прэзыдэнтам ЗША стаў рэспубліканец Джордж Буш*

Вонкавая палітыка традыцыйна займае адно з ключавых месцаў у перадвыбарчых праграмах кандыдатаў. У сваю чаргу, палітыка адносна Расеі традыцыйна зьяўляецца асноўнай тэмай зьнешнепалітычных дыскусіяў. Але, натуральна, актуальнымі для амэрыканцаў ёсьць і іншыя тэмы.

Якія ж пазыцыі Буша адносна вонкавай палітыкі ЗША? Найбольш цікавыя наступныя:

– Буш падтрымлівае амэрыканскую інтэрвэнцыю ў Косава, паколькі "гэта было ў нашых стратэгічных інтарэсах";

– Буш ніколі не разьмесьціць вайсковыя часткі ЗША пад камандай ААН. Разам з тым, Буш падтрымлівае ААН у скарачэньні ўзбраеньняў і падтрыманьні міру;

## *Райс не параіць свайму прэзыдэнту пакінуць Беларусь у сфэры ўплыву Расеі*

– Лідэр рэспубліканцаў будзе ціснуць, патрабуючы рэформваў (у першую чаргу большай празрыстасьці й адказнасьці), на такія міжнародныя фінансавыя інстытуты, як МВФ і Сусьветны Банк;

– Існуючыя санкцыі ў адносінах да Кубы будуць захаваныя да таго часу, пакуль не адбудуцца свабодныя выбары, ня будуць вызваленыя палітычныя вязьні й ня зьявіцца свабода слова.

Апошні пункт сьведчыць, што ЗША займаюць вельмі акрэсьленую пазыцыю адносна грамадзянскіх свабодаў, і трымаюцца сваіх пазыцыяў вельмі цьвёрда, зважаючы толькі на рэальныя зьмены, а не на абяцаньні.

Буш сьцьвярджае таксама, што будзе падтрымліваць нацыі Балтыі, Каўказу й Сярэдняе Азіі, а таксама Ўкраіну ў іх імкненьні да міру ў рэгіёнах, эканамічнага разьвіцьця й усталяваньня шырэйшых стасункаў з усім сьветам.

Нарэшце, палітыка Буша-малодшага ў адносінах да Расеі працягвае традыцыю папярэдніх рэспубліканскіх прэзыдэнтаў. Буш выступае супраць любых далейшых пазыкаў Расеі з боку Міжнароднага Валютнага Фонду. Амэрыканская дапамога й інвэстыцыі будуць скіраваныя "расейскаму народу, а не на банкаўскія рахункі карумпаваных чыноўнікаў". Вельмі жорсткая палітыка рэспубліканцаў і ў дачыненьні да "атакаў супраць мірнага насельніцтва ў Чачэніі".

Але найбольш яскрава палітыку верагодна будучага прэзыдэнта - Буша ў адносінах да Расеі дэманструюць выказваньні 45 гадовае Кандалезы Райс, якая сёньня зьяўляецца галоўным дарадцам Буша ў вонкавай палітыцы, а ў выпадку перамогі стане першым цёмнаскурым дарадцам ў нацыянальнай басьпецы. Райс працавала экспэртам па СССР у Радзе нацыянальнай бясьпекі пры Бушы-старэйшым. Яна лічыць, што рукі суперніка рэспубліканцаў - А. Гора "замараныя справамі з Расеяй".

Пры Бушы, кажа Райс, Расеі прыйдзецца "ісьці сваім шляхам, куды б ён не прывёў, у асноўным абапіраючыся на сябе. Час, калі Расея атрымлівала дапа-

могу практычна мінуў. "Трэба адзначыць, што захад уклаў у Расею з моманту падзеньня камунізму 15 мільярдаў даляраў. "Яны бралі грошы й нічога не рэфармавалі" – сцьвярджае Райс. Яна жорстка крытыкуе адміністрацыю Клінтана за "надта рамантычныя ўяўленьні аб Расеі".



Натуральна, жорсткая палітыка ЗША ў адносінах да Расеі не азначае аўтаматычнага паляпшэньня сытуацыі ў Беларусі. Але аслабленьне Расеі адпавядае нацыянальным інтарэсам нашай краіны, паколькі асноўныя свае сілы гэтая імпэрыя заўсёды скарыстоўвае не дзеля паляпшэньня ўласнага стану, але дзеля вонкавае экспансіі, падтрымкі марыянэткавых рэжымаў, вядзеньня баявых дзеяньняў. З Расеяй можна размаўляць толькі з пазыцыяў сілы, і Буш-малодшы выглядае гатовым да такой размовы. Можна з упэўненасьцю спадзявацца, што цёмнаскурая спадарыня Райс не параіць свайму прэзыдэнту пакінуць Беларусь у сфэры ўплыву Расеі.

Мы зычым Вам перамогі, Джордж В. Буш!

**Аляксей ЯНУКЕВІЧ, сябра міжнароднай камісіі БНФ**

## Заява

*Заява Дзяржэдпартамэнту ЗША*

# БЕЛАРУСЬ: ВЫБАРЫ 15 КАСТРЫЧНІКА НЕ БЫЛІ ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ



Злучаныя Штаты салідарныя са сваімі эўрапейскімі калегамі ў непрызнаньні выбараў, прайшоўшых 15 кастрычніка ў Беларусі, свабоднымі, справядлівымі і празрыстымі. Тэхнічная місія БДІПЧ АБСЭ, а таксама Эўрапейская Парлямэнцкая Тройка прыйшлі да высновы, што выбары не адпавядаюць міжнародным дэмакратычным патрабаваньням. Злучаныя Штаты заяўляюць аб непрызнаньні вынікаў выбараў, і працягваюць лічыць адзіным легітымным парлямэнтам Вярхоўны Савет 13-га скліканьня, пад начала м Сямёна Шарэцкага. Свабодныя, справядлівыя і празрыстыя выбары характарызуюцца ня толькі свабодным доступам грамадзянаў да выбарчых скрыняў у дзень галасаваньня. Гэтая ўмова зьяўляецца толькі неад'емнай рысай такіх выбараў, якія таксама маюць на ўвазе кампанію па свабодным абмене думкамі паміж бакамі, якія балатуюцца на выбарах. Нягледзячы на тое, што і ЗША і ЭЗ і АБСЭ неаднаразова патрабавалі стварыць неабходную атмасфэру вакол выбараў, беларускімі ўладамі не было дасягнута ніякага прагрэсу ў гэтым кірунку.



Непасрэдна ў дзень галасаваньня зьявілася інфармацыя аб фальсыфікацыі вынікаў з боку рэжыму. У парушэньні беларускага выбарчага кодэксу, скрыні для галасаваньня дастаўляліся па месцы жыхарства электарата, якога да таго ж пераконвалі прагаласаваць. Тое, што ўладам прыйшлося пайсьці на такія выключныя меры, сьведчыць пра эфэктыўнасьць кампаніі байкоту выбараў, разгорнутай апазыцыяй.

Злучаныя Штаты глыбока шкадуюць аб тым, што беларускія ўлады праігнаравалі жаданьне ўсё большай колькасьці сваіх грамадзянаў вярнуцца да дэмакратыі, і асуджаюць сур'ёзныя парушэньні, дапушчаныя рэжымам Лукашэнкі падчас выбараў. Прэзыдэнцкія выбары, заплянаваныя на наступны год, павінныя быць пазбаўленыя такога кшталту парушэньняў, у адваротным выпадку яны таксама будуць прызнаныя міжнароднай супольнасьцю нелегітымнымі.

**Філіп РЫКЕР, намесьнік прэсавага сакратара**


vytoki.net

## ЦЭНТРЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ Ў ВІЦЕБСКУ ПРЫПЫНІЛІ СВАЮ ПРАЦУ

У Віцебску спынілі сваю працу Цэнтры разьвіцьця, што былі заснаваныя на базе дзіцячых садкоў N68 і N97. Садкі лічыліся "дашкольнымі ўстановамі новага тыпу", дзе выкарастоўваецца індывідуальны падыход да дзіцяці. Для аплаты працы спэцыялістаў і разьвіцьця матэрыяльнай базы выкарыстоўваліся сродкі бацькоў. Але, як аказалася, Цэнтры разьвіцьця ў нашай краіне ня маюць права заключаць дамовы з бацькамі, калі ня маюць юрыдычнага статусу. Так што цяпер дзеці ў садках не атрымоўваюць "дадатковай увагі".

## АДЛІЧАНАЯ СТУДЭНТКА ЗЬБІРАЕЦЦА ЗЬВЯРТАЦЦА Ў СУД

За актыўны ўдзел у кампаніі "Байкот-2000" з Магілёўскага Дзяржаўнага ўнівэрсытэту была адлічаная актывістка мясцовага Маладога Фронту Ганна Зюзіна. Дзяўчына вучылася на 4 курсе філялягічнага факультэту. 10 кастрычніка яна была выкліканая да дэкана факультэту, які паведаміў ёй аб выключэньні. Падставай для гэтага сталі пропускі заняткаў, якіх у Ганны было ня больш, чым у іншых студэнтаў. Усё на свае месцы паставілі словы дэкана пра тое, што трэба займацца альбо палітыкай, альбо вучобай. На момант выключэньня ў Ганны не было ані запазычанасьцяў, ані вымоваў. Ганна Зюзіна зьбіраецца падаваць скаргу ў суд.

**BARC**

## ЮРАСЬ ПАЛЬЧЭЎСКІ

*Сябра Сойму БНФ,*
*сакратар Управы БНФ*



*Юрась Пальчэўскі нарадзіўся ў Менску 5 сакавіка 1964 г.*

*У 1981 г. закончыў сярэднюю школу № 110 у г. Менску.*

*З 1981 да 1986 г.г. вучыўся ў Менскім радыётэхнічным інстытуце.*

*Закончыў з кваліфікацыяй інжынэр-канструктар-тэхноляг РЭА.*

*З 1986 да 1989 г.г. працаваў інжынэрам на катэдры мікраэлектронікі МРТІ.*

*З 1989 да 1992 г.г. вучыўся ў асьпірантуры пры МРТІ. Мае 3 пасведчаньні на вынаходніцтвы і больш за 20 друкаваных працаў. Асьпірантуру скончыў з дыплёмам інжынэра-дасьледчыка.*

*1992-1994 г.г. працаваў у камэрцыйных структурах.*

*З 1995 г. працуе вядучым інжынэрам Інстытуту тэхнічнай кібэрнэтыкі НАН Беларусі.*

*Жанаты, мае дваіх дзяцей.*

*Грамадзкая актыўнасць:*

*У БНФ са сьнежня 1988 г. Быў дэлегатам Устаноўчага Зьезду БНФ у Вільні. Кіраваў раённай арганізацыяй БНФ Кастрычніцкага р-на г. Менску.*

*З 1995 г. сябра Сойму БНФ.*

*З 1999 г. сакратар Управы БНФ.*

*Веравызнаньне: атэіст.*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:
**220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8,**
**Управа Сойму Партыі БНФ**

Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 1/12 sprava Ж 15

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

______________________ (прозьвішча)

______________________ (імя)

______________________ (імя па бацьку)

**які нарадзіўся «___» ______________ 19___г**

**жыве па адрасе:** ______________ (індэкс і поўны адрас)

______________________

______________________

**род заняткаў:** ______________

**тэл.** ______________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

______ (дата) ______ (подпіс)

НавіНЫ
Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне"
№ 11 (28), кастрычнік 2000 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правох нутранай дакумэнтацыі

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.
Адрас для ліставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net